**Алена Васілевіч "Сябры"**

***1.Азначце партрэт Алены Васілевіч:***

   

а) б) в) г)

***2. Чаму сябравалі Лёня і Грыша:***
а) жылі на адной кватэры; б) былі стрыечнымі братамі;
в) сядзелі за адной партай; г) бацькі жылі побач у вёсцы;
в) дапамагалі адзін аднаму.

***3. Якую «адну дрэнную рысу» меў у сваім характары Грыша:***
а) лёгка паддаваўся ўплыву старэйшых хлопцаў, не меў уласнага пункту гледжання;
б) часта любіў сваволіць дома, а таксама ў школе на ўроку матэматыкі;
в) быў самаўпэўненым, зларадным, вельмі ўражлівым, абыякавым да ўсяго;
г) зняважліва ставіўся да дзяўчынак-аднакласніц, часта дразніў іх;
д) "ён быў упэўнены, што выдатныя адзнакі заслужана ўпрыгожваюць толькі яго дзённік, а ўсім астатнім вучням яны ставяцца проста так..."

***4. За адну кантрольную работу па алгебры амаль палова класа атрымала пяцёркі. Якую адзнаку атрымаў Грыша Міхневіч:***
а) пяць з плюсам; б) чатыры за прапушчаны матэматычны знак;
в) два, таму што спісаў работу з памылкамі ў суседа па парце;
г) тры, таму што не змог рашыць дзве задачы; д) два, таму што прапусціў тэму з-за хваробы.

***5. Чаму Лёня адстаў ад Грышы, калі ішлі дадому:***
а) Лёня хацеў даказаць, што сам зможа дабрацца дадому хутчэй напрасткі праз густы сасоннік;
б) прыпомніў сябру былую крыўду;
в) у яго разбалелася нага, якую зламаў летам;
г) не хацеў паказваць сябру больш кароткі шлях дадому праз балота;
д) захацеў праверыць сябра на смеласць, храбрасць.

***6. Лёня застаецца адзін у лесе. Што робіць ён, пакрыўджаны на сябра, знясілены мяцеліцай:***
а) уяўляе сцэну сустрэчы дома з бацькам і маці;
б) збіваецца ў цёмным лесе з дарогі;
в) трапляе ў балота;
г) думае, як адпомсціць сябру Грышу;
д) баіцца, што сустрэнецца ў ельніку з ваўкамі.

***7. На што захварэў Лёня пасля таго, як увесь мокры і скарчанелы пасядзеў пад стогам:***
а) гаймарыт; б) ангіна; в) адзёр; г) грып; д) запаленне лёгкіх.

***8. Як аднесліся да прыходу Грышы ў іх дом пасля здарэння бацькі Лёні і сам Лёня:***
а) маці сустрэла не вельмі ветліва, здзекавалася з паводзін Грышы;
б) бацька запрасіў заходзіць і паказаць Лёню, што ў класе вывучылі пад час яго хваробы;
в) выгналі з пазорам з хаты; г) Лёня не захацеў бычыць былога сябра;
д) Лёня быў шчаслівы, што прыйшоў Грыша, каб разам вучыць урокі.

***9. Невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя – гэта:***
а) аповесць; б) раман; в) апявданне; г) мініяцюра; д) навэла.

***10. Вызначце асноўную тэму апавядання Алены Васілевіч "Сябры":***
а) выбар, узаемаадносіны у дзіцячым калектыве;
б) адказнасць за свае паводзіны, учынкі ў экстрымальнай сітуацыі;
в) дружбы паміж падлеткамі;
г) паказ жыцця вясковых дзяцей 11-12 гадоў у пачатку XX стагоддзя;
д) апісанне хараства беларускай прыроды зімой.